# «БЕЛАРУСКАМУ ВАКЗАЛУ» — 50

**«Беларусь 3» 10 мая прапануе прыхільнікам класікі кінастужку «Беларускі вакзал» рэжысёра Андрэя Смірнова, якая ўбачыла свет у 1970 годзе.**

Гэта гісторыя сяброў, што развіталіся на вакзале летам 1945 года, а потым зноў сустрэліся праз чвэрць стагоддзя на пахаванні баявога сябра. Дырэктар завода (былы камандзір роты) Харламаў, слесар Прыходзька (франтавы разведчык), бухгалтар Дубінскі (у мінулым — радыст) і журналіст Кірушын (які быў сапёрам) — усе яны згадаюць ваеннае мінулае і франтавое сяброўства і праявяць сябе ў новых абставінах, застаючыся адданымі і прагнымі да жыцця...

Фільм быў удастоены Галоўнай прэміі на I Фестывалі сучаснай кінематаграфіі ў Карлавых Варах у 1971 годзе. Першапачатковы сцэнарый быў напісаны Вадзімам Труніным у 1966 годзе і адрозніваўся ад знятай кінастужкі. Першым на яго звярнуў увагу рэжысёр Марк Асеп'ян, якога крануў і зацікавіў эпізод сутыкнення ў рэстаране прадстаўнікоў розных пакаленняў, што ў выніку стала для рэжысёра штуршком выпусціць у 1968 годзе праблемны фільм пра моладзь 1960-х пад назвай «Тры дні Віктара Чарнышова». А за здымкі «Беларускага вакзала» ўзяўся Андрэй Смірноў. У карціне паказаны кантраст узаемаадносін франтавікоў і маладога пакалення. У фінале фільма гучыць песня «Нам нужна одна победа», якая была напісана спецыяльна для «Беларускага вакзала». Гэтая кампазіцыя пра дэсантны батальён стала «прапускным білетам» кінастужкі да гледача: паказ хацелі забараніць, убачыўшы ў карціне дыскрэдытацыю савецкай міліцыі, але песня вельмі спадабалася уладам, і фільм дазволілі.



Не прапусціце кіно 10 мая на «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 93**

Наступную задачу ***(гл. дыяграму)*** склалі для нашых чытачоў майстар спорту Мікалай Бельчыкаў з Барысава і Мікалай Быкаў з Баранавіцкага раёна (сёлета іх дуэт адзначае 50-годдзе сумеснай творчай дзейнасці).



**Белыя:** Кра8, Фа4, Kf8, Kh5, пf7 (5).

**Чорныя:** Kph8, Ле7, пп. a3, b4, h6 (5).

Мат за 3 хады.

У пачатковай пазіцыі ёсць два варыянты з шахамі беламу каралю: 1... Ла7+ 2. Ф:а7 і 3. Фd4х, 1... Ле8+ 2. Ф:е8 і 3. Фе5х. У рашэнні пасля першага ходу на тыя ж шахі другія хады белых змяняюцца. Прапануем чытачам самім знайсці варыянты рашэння.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У гэтай пазіцыі з партыі чорныя пагражаюць матам на h2, але чарга ходу за белымі, таму яны праводзяць пераможную камбінацыю. Паспрабуйце яе знайсці.

**Белыя:** Kph1, Фа3, Лd1, Ле1, Kd6, пп. a2, b2, h3 (8).

**Чорныя:** Kpg8, Фf4, Лc2, Cg7, пп. a5, b6, f7, g5, h6 (9).

* * *

Прапануем для самастойнага аналізу дзве пераможныя партыі беларускіх шахматыстаў. Першая была згуляна летась на Сусветнай юнацкай алімпіядзе, другая — на чэмпіянаце Еўропы.

Лачазар Колеў — Аляксандра Тарасенка. 1. e4 e6 2. Kf3 d5 3. Kc3 d4 4. Ke2 c5 5. c3 Kc6 6. cd Kf6 7. Kg3 cd 8. d3 Cd6 9. Ce2 0-0 10. 0-0 h6 11. Ke1 e5 12. f4 ef 13. C:f4 C:f4 14. Л:f4 Фd6 15. Фd2 Ke5 16. Kc2 Kg6 17. Лf2 Kg4 18. C:g4 C:g4 19. Лaf1 Лac8 20. Ka3 Ke5 21. h3 Cd7 22. Ke2 Фg6 23. Kph1 Лfd8 24. Kf4 Фg3 25. Kc4 K:c4 26. dc Ce8 27. b3 Лc6 28. Kd5 Ле6 29. Ф:d4 Kph8 30. Ф:a7 Cc6 31. Фd4 f6 32. b4 Ле5 33. b5 Ce8 34. Лf3 Фg6 35. Фb6 Лc8 36. Ф:b7 Л:c4 37. Ke7 Фf7 38. Kg6+ Ф:g6 39. b6 Лc2 40. Л3f2 Л:f2 41. Л:f2 Фg3 42. Лc2 Лb5 43. Фa8 Лb1+, 0:1.

Уладзіслаў Кавалёў — Аляксандр Інджыч. 1. e4 c5 2. Kc3 a6 3. Kf3 d6 4. d4 cd 5. K:d4 Kf6 6. h3 e6 7. g4 h6 8. Cg2 g5 9. Kde2 Kc6 10. f4 Лg8 11. Лf1 Kd7 12. Ce3 gf 13. K:f4 Kce5 14. Kh5 b5 15. Фd2 Cb7 16. 0-0-0 Лg5 17. Kpb1 Лc8 18. Cd4 Лc4 19. Ke2 Фc7 20. b3 Лc5 21. Лf2 Ce7 22. Kef4 b4 23. Kd3 K:d3 24. cd a5 25. Фf4 Ke5 26. C:e5 de 27. Ф:f7+ Kpd8 28. Kg7 Л:g7 29. Ф:g7 Лc3 30. d4 Ca6 31. Cf1 C:f1 32. Фg8+ Kpd7 33. Лf:f1 Фc6 34. d5 Фb6 35. de+, 1:0.

* * *

Фінішаваў завочны (праз інтэрнэт) шахматны матч зборных Беларусі і Украіны на 33 дошках (кожны ўдзельнік гуляў па дзве партыі). Беларуская каманда перамагла з лікам 34,5:31,5. Па дзве перамогі на сваіх дошках атрымалі мінскія шахматысты В. Астраўх, А. Русак і А. Літвіненка, якія былі ўзнагароджаны дыпломамі і прызамі.

А з мінулай восені зборная Беларусі гуляе аналагічны матч супраць Германіі на 50 дошках.

* * *

Скончыўся буйны інтэрнэт-турнір па гульні ў бліц, які праводзіў шахматны сайт chess.com. Сярод 128 удзельнікаў было шмат славутых гросмайстраў, у тым ліку дзеючы чэмпіён свету Магнус Карлсен (Нарвегія). Ён ўпэўнена дайшоў да фіналу, але там нечакана прайграў маладому іранскаму гросмайстру Аліразе Фіруджы — 7,5:8,5.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Фа8! Не вядзе да мэты 1. Фh8? d5! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





Сядзі і глядзі

# КІНО ДЛЯ СВАІХ

**Пакуль нас настойліва заклікаюць заставацца па магчымасці дома, прагляд любімых фільмаў — адзін з бяспройгрышных варыянтаў, каб бавіць час з карысцю. Калі акцэнтаваць увагу на стужках айчыннай вытворчасці, то ў гэтыя выхадныя беларускія тэлеканалы прапануюць кіно на розныя густы: ваенна-прыгодніцкі баявік «Снайпер: зброя помсты», музычную казку «Прыгоды Бураціна», народную камедыю «Белыя росы» і яе працяг «Белыя росы. Вяртанне».**



Ваенная драма «Снайпер: зброя помсты», знятая ў 2009 годзе рэжысёрам Аляксандрам Яфрэмавым, мае інтэрнацыянальны склад акцёраў, сярод якіх Дзмітрый Пяўцоў, Марыя Міронава, Ганна Хітрык, Іван Мацкевіч і іншыя (пільны глядач заўважыць у кадры нават самога рэжысёра). Гісторыя ў карціне пачынаецца з падзей у Сталінградзе ў 1942 годзе. Група савецкіх снайпераў на чале з лейтэнантам Яшыным сутыкаецца з праціўнікам — нямецкім капітанам Карлам Кляйнстам. У гэтым баі гіне дзяўчына з групы савецкіх снайпераў Алеся, а сам Яшын атрымлівае цяжкае раненне... Наступным разам мы сустракаем галоўнага героя пасля заканчэння вайны — на пасадзе каменданта ў невялікім нямецкім мястэчку. Яго памочнік знаходзіць у будынку старой мануфактуры падазроныя чарцяжы, якія, як потым высвятляецца, маюць дачыненне да вядомай нямецкай ракеты «Фау». Разабрацца ў іх трэба вучонаму-ракетчыку з Масквы і яго асістэнтцы. Аднак у хуткім часе высвятляецца, што ў сакрэтнай лабараторыі працуе група Кляйнста. Так Яшыну выпадае магчымасць адпомсціць за сваё загінулае каханне. Чым скончыцца сустрэча зацятых ворагаў, глядзіце ў вячэрнім кінасеансе на «Беларусь 3» 1 мая ў 21.05.





Таксама сацыякультурны канал пакажа ў выхадныя фільм-казку «Прыгоды Бураціна» — дарэчы, савецкія гледачы ўпершыню ўбачылі яе ажно 45 гадоў таму. Мастацкі фільм Леаніда Нячаева, зняты паводле казкі Аляксея Талстога «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна», весела і вонкава лёгка расказвае пра прыгоды драўлянага хлопчыка, які з дапамогай сяброў перамагае зло і змяняецца да лепшага сам. Не прапусціце магчымасць вярнуцца ў дзяцінства 2 мая ў 11.25 на «Беларусь 3».

«Сталічнае тэлебачанне» ў першы дзень мая прапануе гледачам класіку — камедыю «Белыя росы» (1983) рэжысёра Ігара Дабралюбава. Такія фільмы для сучасных гледачоў — нібы падарожжа ў часе, падчас якога можна пранікнуцца атмасферай жыцця вёскі і яе насельнікаў. Карціна, дарэчы, стала ў свой час самай касавай па грашовых зборах (пабіць гэты рэкорд удалося толькі праз шэсць гадоў фільму «Мяне завуць Арлекіна»), а часопіс «Савецкі экран» назваў яе найлепшай камедыяй года. У 2014 годзе выйшаў у пракат працяг фільма — «Белыя росы. Вяртанне» рэжысёра Аляксандры Бутар. Новае вырашэнне дылемы «горад vs вёска» таксама можна будзе ўбачыць на СТБ 1 мая ў 21.00, а паглядзець паўтор кожнай стужкі — у суботу і нядзелю.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота www.kino-teatr.ru**